***Ганна Барвенава***

**«АГНЁМ АДДАЦЬ ЦЕЛА БОГУ, ДУШЫ - ЗЛАДІЦЬ ТРЫЗНУ...»** *(да пытання рытуальных прадметаў у пахаванні)*

На працягу тысяч гадоў змяняўся інвентар (мал.1) беларускіх пахаванняў (адзенне, рытуальныя рэчы, амулеты), варыянты пакладання нябожчыка (арыентацыя цела, месцаванне рук), спосабы ўладкавання апошняга прытулку памерлага (абкладанне камянямі, насыпанне курганоў, выраб драўляных трунаў, сланцавых саркафагаў і г.д.), а выкарыстанне агню, рытуальных рэчаў, паслядоўнасць рытуалу пераходзілі праз тысячагоддзі і не залежалі ад грамадскага статуса нябожчыка.

Пісьмовыя помнікі Сярэднявечча, сярод якіх «Запісы» Ахмеда Ібн-Фадлана (921 г.), «Хроніка Лівоніі» Генрыха Латвійскага (1186-1227 г.) летапісная ўстаўка «легенда пра Совія» ў «Хроніцы Іаана Малалы» (1261 г.) і інш., пазнейшыя фальклорныя паданні ў супастаўленні з археалагічнымі матэрыяламі пацвярджаюць заканамернасць кампанентаў абраду пахавання і іх ўзаемадапаўняльнасць. Знакі продкаў.
дзядоў памерлага - агонь, попел, гаршчэчак - захаваліся ў шматлікіх рытуалах беларусаў [4]. *Як* тлумачыў «рус» паслу Ахмеду Ібн-Фадлану: «*... мы спальваем яго ў агні ў адно імгненне, і ён у той самы час уходзіць у рай*» [3]. У сярэднявечных пахаваннях нярэдка ля шкілетаў знаходзяць фрагменты глінянага гаршчка, на вяршыні насыпу фіксуюць рэшткі вогнішча з раструшчаным гаршчком, побач з магілай - ахвярапрынашэнні - абпаленыя косткі жывёлін (часцей сабак, коней). Агонь заставаўся неад'емным кампанентам пахавальнага абраду ў XVI-XVII стст. У раскопах могілак Замчышча Глуска выяўлены рэшткі вогнішча каля трун, якое палілася часам вышэй, часам ніжэй, але заўсёды ў самой магільнай яме ў нагах нябожчыка. Тое ж назіраецца і ў пахаваннях у Магілёве. Магчыма, гэта сведчыць пра існаванне некаторых элементаў дахрысціянскіх вераванняў у светапоглядзе нашых продкаў [2].



***Малюнак І*** - Знаходкі з Маскавіцкага паселішча ў шасці кіламетрах ад Браслава, на беразе возера Дзерба

Выкарыстанне ў пахавальным рытуале візуальных атрыбутаў грамадскага становішча чапавека пры жыцці, сярод якіх адзенне, упрыгожанні, амулеты, апазнавальныя знакі (у тым ліку інсігніі - знакі ўлады) магло захавацца з дахрысціянскіх часоў, але было падхоплена і атрымала развіццё ў часы Сярэднявечча. Новае адзенне, абутак шыліся адмыслова дзеля абраду пахавання: *«даведаўся* (Ібн- Фадлан) *пра смерць знатнага чалавека* (руса). *Яны паклалі яго ў магілу і паклалі зверху накрыўку пакуль, на працягу дзесяці дзён, не скончылі крою і шыцця адзення для Яго».* Тканіны на адзенне. тканіны на каўнер выбіраліся з лепшых гатункаў, пры гэтым колер паўтараў колеры святочнага прыжыццёвага адзення: *«Яму апранулі шаравары, панчохі, боты, куртку і каптан з дзібаджа з залатымі гузікамі, надзеліяму на галаву калансуву з дзібаджа з собалем»* [3]. Зброю і прылады працы ўкладалі ў труну тыя, якімі карыстаўся сам нябожчык.

У пахаваннях старажытных ваяроў XI—XII стст. выяўлены фрагменты каштоўнай тканіны, адзення (шаўковыя кашулі, шаўковыя ці залататканыя вышываныя каўняры), знойдзены паясы з металічнымі накладкамі, зброя. Да прыкладу, у Віцебскай вобласці даследавалася ўнікальнае Друцкае пахаванне паводле паганскага звычаю 38 ваяроў разам з военачальнікам. У цэнтры кургана - каменны саркафаг з чэрапам (пахаванне ў адпаведнасці з належным цырыманіялам абавязкова ладзілася і тады, калі хавалі толькі галаву нябожчыка, частку яго цела). Гэта пацвярджаюць таксама пісьмовыя помнікі, у прыватнасці, «Хроніка Лівоніі»: «У *выглядзе выкупу ... потым аддалі галаву таго забітага літоўца, каб, атрымаўшы хоць бы галаву, там маглі зладзіць яму належнае пахаванне з трызнай па звычаі язычнікаў*» [5, с.150]. Даследчыкаў уразіў рост большасці пахаваных - каля двух метраў (пры сярэднім росце сярэднявечных людзей каля 160 см). У адным з пахаванняў археолагі выявілі рэшткі шаўковага каўнерыка з арнаментам, які быў характэрны для візантыйскіх тканін. Друцкі курган, на думку доктара гістарычных навук В. Ляўко, - адзіны ва Усходняй Еўропе, дзе ёсць пахаванні паводле паганскага абраду, і разам з тым прысутнічае каменны саркафаг [6].

Знакамі ўлады караля, вялікага князя, княгіні былі карона, дзяржаўны яблык, жазло; каштоўнае адзенне; упрыгожанні (пярсцёнак, ланцуг, крыж, падвес з гербам). У труну ўкладаліся не прыжыццёвыя інсігніі, а іх копіі з больш таннага матэрыялу: дзяржаўны яблык і жазло з дрэва, пакрытага пазалотай, карона з больш таннага металу або са скуры, таксама пазалочаная. Пахавальнае адзенне ўладароў сярэднявечных дзяржаваў-княстваў X-XII1 стст. выконвалася з каштоўных гатункаў тканіны, у тым ліку замежных шаўкоў (вянок, каўнер, наручы). Падобныя знаходкі былі выяўлены ў крыптавых пахаваннях храмаў Мінска, Турава, Гародні. Да адзення дадаваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўпрыгожанні з золата і срэбра: створкавы або віты бранзалет, пярсцёнак, завушніца з золата, срэбра, нярэдка аздобленыя эмалямі, каштоўнымі камянямі (мал. 2). Абутак, знойдзены ў храмавых пахаваннях (Мінск, Гародня) быў выкананы адмыслова да абраду, вышыты шаўковымі і ваўнянымі ніткамі.

Асаблівай увагі заслугоўваюць пахаванні святароў. Вышэйшае святарства суправаджалі пасля смерці інсігніі і рэліквіі. На тэрыторыі Беларусі такія пахаванні не апісаны, але на тэрыторыі сярэднявечнай Еўропы IX-XIV стст. вядома каля 400 трун абатаў. У пахаваннях капланаў у крыптах храмаў выяўлены фрагменты святарскіх і пантыфікальных шатаў, у тым ліку вытканых золатам. Строй біскупа складаўся з альбы, далматыкі, арната, стулы, маніпуляра, рукавічак, панчох, сандаляў; аббата - з тунікі, плашча з каптурам, панчох, сандаляў, у капланаў дадавалася стула [7, с. 20, 76]. Інсігніі біскупа - пярсцёнак, надзеты на рукавічку на сярэдні палец правай рукі, як сімвал шлюбу біскупа з Касцёлам (пярсцёнак-пячатка - гэта не літургічны сімвал, а найстарэйшы знак улады), пастарал («пастухоўскі кій», у пахаваннях сустракаецца з пачатку XI ст. пры правай руцэ памерлага), мітра (з другой пал. XII ст.). Радзей у труну ўкладаліся прадметы святарства - келіх з віном і талерачка з гостыяй (прасвіркай, інакш хлебам), або толькі гостыя. Трумныя інсігніі былі звычайна копіямі прыжыццёвых, выкананых непасрэдна ў мэтах сепулькральных (адмыслова дзеля хаўтураў, пахавання).



*Малюнак 2* - Інсігніі з храмавых княжацкіх пахаванняў XI - XIII стст. Пярсцёнак, золата, Полацк. Бранзалет, золата, Менск. Завушніцы, золата, Гародня.

Святароў хавалі ў крыпце храма, дзе адбывалася іх святарства, біскупаў і архібіскупаў у кафедральным саборы ў заходняй частцы храма [7, с. 36-37]. У труну ўкладалі алавяную ідэнтыфікацыйную шыльду, на якой указвалася імя, функцыя, дата смерці і Credo [7, с. 30]. Для некаторых французскіх правінцый характэрна ўкладанне ў труну запаленых алейных лямпаў або гліняных гаршчкоў з гарачым вуголлем з мэтай выпальвання паветра ў саркафагу і муміфікацыі цела [7, с. 31]. Калі святар паміраў або гінуў далёка ад месца святарства, яго прывозілі да роднага храма.

Вада сімвалізавала раку жыцця і смерці, таму праводзілі ў апошні шлях па вадзе або праходзілі пахавальнай працэсіяй каля ракі. Нават адрынутага стода (ідала) «высылалі» вадою на плыце: *«звязалі плыт з бярвення, паклалі на яго галаву того ўяўнага бога і з дапамогай веры хрысціянскай адправілі за мора»* [5, с. 65]. Пад Кукейносам ваярамі Вячкі *«забіта было сямнаццаць чалавек* (братоў-рыцараў), *а трое выратавалася ўцёкамі. Трупы,* кінуўшы у Дзвіну, паслалі рыжанам, *і тыя, выняўшы з вады целы палеглых на службе божай, поўныя глыбокай пашаны і са слязьмі пахавалі іх»* [5, с. 103].

Вясковыя пахаванні IX—XIII стст. у грунтовых могільніках (напрыклад, на паўночным захадзе Беларусі) вызначаюцца лаканічнасцю і сціпласцю, а таксама наяўнасцю ў адноснай большасць з іх звычайных побытавых рэчаў, у тым ліку прыладаў працы. У жаночых пахаваннях па звычаі трупапакладання на грунце знойдзены каралі са шкляных пацерак, шыйныя грыўні, падковападобныя фібулы, гузікі, пярсцёнкі, скроневыя колцы, а таксама (зрэдку) крыжыкі, манетападобныя падвескі; з прылад працы выяўлена шмат жалезных ножыкаў, праслачкаў, нават іголак з ніткай. У мужчынскіх пахаваннях знойдзены спражкі, гузікі, сякеры, навершшы дзідаў. І ў жаночых, і ў мужчынскіх пахаваннях каля ног нябожчыка стаяў гліняны гаршчок. Рытуальнае ахвяраванне жывёл - коней, сабак, певеняў - адбывалася і пры крэмацыі, і пры трупапакладанні. Працяглы час існавала і чалавечае самаахвяраванне. Пра гэта распавёў Ібн-Фадлана (IX ст.), звычай самаахвяравання ўгадваецца ў «Хроніцы Лівоніі» (XIII ст.): *«Адзін святар, які быў у той час у палоне ў літоўцаў на імя Іаан, распавядаў, што там пяцьдзесят жанчын, што страцілі мужоў, пасля гэтага павесіліся. Гэта таму, вядома, што яны спадзяваліся неўзабаве ж сустрэцца з іміў іншым жыцці»* [5, с. 79].

Абрад пахавання на працягу тысячагоддзяў успрымаўся як сустрэча грамадскага ладу з касмічным сусветам, як сустрэча чалавека з Богам (незалежна ад веравызнання), як развага пра містычнасць жыцця. Пахаванне павінна было адпавядаць рытму, зладжанасці і накірункам грамадскага быцця, былому і будучаму месцу ў ім нябожчыка. Сам абрад быў заснаваны на судакрананні ладу грамадскага з сусветам касмічным і мусіў гэта пацвердзіць. У мове пахавальных песняў, галашэнняў, літанняў, сімвалічнай мове жэстаў, якія былі зразумелыя для ўсіх удзельнікаў абраду, рэалізоўвалася пэўная схематычная структура міжасабовых адносін, якая падкрэслівала існы «натуральны» парадак рэчаў (сямейных сувязяў, грамадскага ладу, прыроды) і занятае ў ім месца памерлага. У грамадскай іерархіі Сярэднявечча да каранаваных уладароў, князёў, першасвятароў ставіліся як да «боскіх памазандаў», таму ў тыя часы быў распрацаваны адметны ад іншых цырыманіял каралеўскіх і біскупскіх пахаванняў.

Пры ўсіх адрозненнях цырыманіялу пахавання ў розных сацыяльных групах ёсць тое, што іх яднае: культ агню і вады, сімвалічнасць места пахавання, паслядоўнасць рытуальных дзеянняў. Нябожчык на сустрэчу з Богам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апрануты ў святочнае адзенне, ён у новым абутку, яму неабходныя візуальныя адзнакі яго ролі ў грамадстве (знакі ўлады; сімвалы хрысціянскага служэння; зброя; прылады працы), асабістыя амулеты і ўпрыгожанні.

**Спіс літаратуры:**


1. Весткі з экспедыцый беларускіх археолагаў (сезон 1998) // Беларускі гістарычны агляд. - Т. 5. - Сш. 2(9)//http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/bha/05-2/14.htin. Доступ 05.12.2010.
2. Ганецкая, І. Замчышча адкрывае сакрэты / І. Ганецкая [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://www.gluskonline.net/index/0-43. - Дата доступу: 15.03.2011.
3. Ковалевский, А.П. Книга Ахмеда Ибн-Фадлана о его путешествии на Волгу в 921-922 гг. : ст., пер. и ком. / А.П. Ковалевский. - Харьков : Изд-во Харьк. ун-та, 1956. - 347 с.
4. Кухаронак, Т.А. Пахавальна-памінальныя звычаі і абрады// Беларусы. Т. 5. Сям'я. - Мінск: Бел. навука, 2001.-С. 351-370.
5. Латвийский, Г. Хроника Ливонии / Г. Латвийский. - 2-е изд.; введ., перев., ком. С.А. Аннинского. - М.;Л.: Изд-во Акад. наук СССР, 1938.-351 с.
6. Пахаванне сярэдня веч нага спецназу // Наша ніва. - 2009. - 23 верасня [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http://nn.by/?c=ar&i=29779. - Дата доступу: 15.03.2011
7. D^browska, E. Groby, relikwie i inszgnia. Studia z dziejow mentalnosci sredniowiecznej / E. D^browska - Warszawa: Wyd. Instytutu archeologii i etnologii PAN, 2008. - 376 s.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ